УДК 94(476.4-25)

# НАРЫС Х. ШЫНКЛЕРА “МАГІЛЁЎ” ЯК УЗОР РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ ГІСТОРЫІ ГОРАДА Ў ДАВАЕННЫ ПЕРЫЯД

Балбераў Яўген Сяргеевіч
галоўны захавальнік фондаў УК “Музей гісторыі Магілёва”,
магістр гістарычных навук
(г. Магілёў, Беларусь)

*У артыкуле разглядаецца малавядомы нарыс Хвядоса Шынклера “Магілёў”, напісаны ў 1938 г. У гэтым нарысе аўтар коратка ў гістарычнай паслядоўнасці асвяціў асноўныя моманты магілёўскай гісторыі ад мінуўшчыны да 30-х гг. XX ст.*

Хвядос Сяргеевіч Шынклер нарадзіўся 22 верасня 1903 г. на станцыі Рудзенск Мінскага павета (цяпер Пухавіцкіраён Мінскай вобласці). У 19141920 гг. вучыўся ў Мінскім рэальным вучылішчы. Не пакідаючы вучобы, з 1919 г. пачаў працаваць тэлеграфістам на чыгунцы, на станцыі Рудзенск. Уваходзіў улітаратурнае аб’яднанне «Маладняк», пазней – БелАПП [1, с. 421]. З 1929 г. – супрацоўнік бабруйскай акруговай газеты «Камуніст», а са снежня 1931 г. – сакратар рэдакцыі раённа-транспартнай газеты «Ударнік» у Жлобіне. У 1935–1941 гг. працаваў у газеце «Літаратура і мастацтва» і часопісе «Полымя рэвалюцыі» [2].

З пачаткам вайны эвакуіраваўся ў г. Свярдлоўск (Расія), у 1942 г. добраахвотна пайшоў у армію. Закончыўшы чатырохмесячныя курсы, трапіў на фронт. З кастрычніка 1942 г. – камандзіру звода 1-й роты 93-й асобай стралковай дывізіі. Малодшы лейтэнант Шынклер загінуў 25 кастрычніка 1942 г. на схіле безыменнай вышыні 95,9 каля пасёлка Бекетаўка пад Сталінградам [3, с. 326].

Нарыс “Магілёў” быў напісаны Х. Шынклерам у 1938 г. У тыя часы цікавасць да Магілёва і яго гісторыі невыпадковая. Менавіта тады рыхтаваўся перанос сталіцы з Мінска ў Магілёў, наш горад быў у цэнтры ўвагі ўсёй рэспублікі. Як вядома, пасля падзей верасня 1939 г. пытанне аб пераносе сталіцы з Мінска ў Магілёў канчаткова адпала. Але твор Х. Шынклера застаўся як помнік падзеям тых часоў, як крыніца па гісторыі нашага горада.Тэкст нарыса займае літаральна дзесяць старонак. Аўтар знаёміць чытача з гісторыяй Магілёва ад часоў старажытных паданняў і да сучасных яму 1930-х гг. Канешне, адразу трэба зрабіць некалькі заўваг. Па-першае, гэта не твор прафесійнага гісторыка, а нарыс журналіста; па-другое, усе факты і падзеі ў нарысе, улічваючы абставіны часу, падаюцца з пункту гледзішча ідэй класавай барацьбы і бальшавісцкай ідэалогіі.

Пачынае аўтар з падання пра Машэку, нават цытуе урывак з паэмы “Магіла льва” Янкі Купалы. “Паданне пра Машэку нясе ў сабе і адну з народных версій пра заснаванне і назву горада Магілёва”, – адзначае Шынклер [4, с. 411].

Узгадвае Шынклер і старадаўнія летапісы, не прымінуўшы адзначыць суб’ектыўнасць летапісцаў: “Не абмінулі Магілёва і старадаўнія летапісцы. Кожны з іх, клапоцячыся пра ўслаўленне свайго ўладара-князя, гонар заснавання Магілёва лічыць ягонай заслугай. Але ў сцвярджэннях летапісцаў не менш легендарнага, чым у народных паданнях” [4, с. 411]. Разам з тым, сярод “падаўцаў “весцяў дзіўных з быўшых год” аўтар знаходзіць і такіх, у якіх “рацыянальнае мысленне пераважае над узлётам фантазіі”. Маецца на ўвазе знакаміты верш, складзены пра Магілёў у 1625 годзе: “От могилок Могильовчому бы прозвано?” Далей Х. Шынклер распавядае пра археалагічныя даследаванні, якія “ў ваколіцах і ў межах горада выявілі стаянкі людзей каменнага веку – гарадзішчы, у якіх знойдзены рэчы славянскага ўжытку” [4, с. 412].

Але ж усё гэта – сівая мінуўшчына. Аўтар зазначае, што толькі гістарычныя крыніцы пачатку XVI стагоддзя даюць першыя дакладныя весткі аб Магілёве. З тых крыніц вынікае, што “ў канцы XIV стагоддзя Магілёў з воласцю падпадаў пад уладу Літоўскага феадальнага княства і пераходзіў ад аднаго княскага дзяржаўцы да другога” [4, с. 412]. Сярод гістарычных фактаў аўтар узгадвае будаўніцтва ў 1503–1526 гг. Магілёўскага замка, распавядае, дзе месціўся гарадскі астрог і рынак, пералічвае асноўныя рамесніцкія спецыяльнасці, накірункі гандлю магілёўскіх гандляроў і асноўныя падаткі і павіннасці гараджан. Асобнае месца ў нарысе адведзена гісторыі магілёўскага самакіравання. Аўтар распавядае пра наданне гораду спачатку малога магдэбургскага права, а затым і вялікага, тлумачыць сістэму гарадскога самакіравання.

Шынклер апісвае розныя падзеі, якія адбываліся ў гісторыі горада. Так, ён узгадвае бітву казакоў Налівайкі з войскам Радзівіла на Буйніцкім полі ў 1595 г. Таксама ўзгадвае авантуру Ілжэдзмітрыя II: “Гэты польскі авантурнік з’явіўся ў Магілёве … у “цару Дзмітрыю” магілёўцы пазналі Дзімітра Нагога, які яшчэ нядаўна ў магілёўскага папа Сасіновіча дзяцей грамаце вучыў і жыў у праскурніка Цярэшкі” [4, с. 414].

Закранае аўтар і падзеі рэлігійнага жыцця. Так, ідэю царкоўнай уніі ён падае як спосаб “хутчэй і лягчэй ачмурыць просты народ, канчаткова зняволіць яго і апалячыць” [4, с. 415]. Прыгадваецца ў нарысе і няўдалы візіт у Магілёў уніяцкага арцыбіскупа Іёзафата Кунцэвіча ў 1618 г., перад якім магілёўцы “замкнулі вароты, сталі на сценах астрога і папярэдзілі, штосустрэнуць ягобоем гарматным” [4, с. 416]. Аўтар прыгадвае факт заснавання ў Магілёве езуіцкай місіі ў 1668 г. З гэтай прычыны “шляхта робіцца больш нахабнай, заносчывай”. У гэтым кантэксце аўтар рэтранслюе гарадскую легенду пра забойства шляхціча Зяньковіча ў 1692 г. магілёўскімі рамеснікамі і пабудову кармеліцкага касцёла з цэглы дамоў удзельнікаў расправы над шляхціцам [4, с. 417].

Таксама Х. Шынклер адзначае факт пераводу судаводства ў Магілёве на польскую мову з 1697г. і негатыўныя наступствы паланізацыі.

Апісваюцца ў нарысе і знакамітыя магілёўскія бунты XVII ст. Паказваюцца таксама падзеі казацкага паўстання Хмяльніцкага, і вайна 1654-1667 гг. Так, аўтар прыгадвае, што Магілёў у 1654г. без бою здаўся рускаму войску, бо “мяшчане магілёўскія надумаліся падацца да маскоўскага, адзінай з імі веры, цара”. Але ж ласкі магілёўцы не зведалі – царскія ваяводыіпалкоўнікі “рабавалісялян, прыгняталі мяшчан”. Яўрэям нават забаранілі жыць у горадзе. Аўтар у гэтай сувязі прыгадвае злачынны ўчынак палкоўніка Паклонскага, які “вывеў 7 тысяч яўрэяў на Пячэрск, тут абрабаваў і па-зверску ўсіх забіў”. Але ж, неглядзячы на такія злачынствы, Шынклер падае падзеі магілёўскага паўстання 1661 г. супраць маскоўскага гарнізона не як помсту магілёўцаў за прыгнячэнні і рабаванні, а як змову прыхільнікаў польскіх паноў, у выніку якой “Магілёў ізноў падпаў пад Польшчу” [4, с. 416].

Прыгадваючы падзеі 18 ст., аўтар узгадвае Пятра I і Карла XII, якія бывалі ў Магілёве падчас вайны. Апошні атрымаў тут мянушку “сатаны” – за вялікі ўціск, непамерныя кантрыбуцыі, адбіранне прадуктовых запасаў. Згадваецца і пра тое, што Пётр I у 1708 г. загадаў спаліць горад, “ператвораны шведамі ў апорны пункт”. І тут жа дадае, што “ў наступным годзе Пётр дазволіў адбудаваць горад і вызваліў яго жыхароў ад усіх падаткаў”. Далей прыгадваецца першы падзел Рэчы Паспалітай 1772 г., канчатковы ўваход Магілёва ў склад Расійскай дзяржавы, ператварэнне яго ў 1778 г. у цэнтар Беларускага намесніцтва [4, с. 417].

Ёсць месца ў нарысе і для падзей 1812 г. Так, прыгадваецца бой авангарда рускай 2-й арміі пад камандаваннем Раеўскага з французскім корпусам Даву ля Дашкаўкі, у выніку якога “фран-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

цузы былі адкінуты да Салтанаўкі" [4, с. 417]. Апісваецца марадзёрства французаў у горадзе, гвалтоўнаепрывядзенне да прысягі гараджан, здрада епіскапа Варлаама Шышыцкага і шляхты. А таксама той факт, што французы, адыходзячы, спалілі свій абоз на рынку ў Магілёве. Далей прыгадваецца эпізод, звязаны з паўстаннем дзекабрыстаў. Так, дзекабрыста Пестэля дапытвалі ў Магілёве ў памяшканні езуіцкай калегіі [4, с. 418].

Адводзіць аўтар месца і апісанням губернскага Магілёва. Прыгадваецца стварэнне гарадскога сада, будаўніцтва гарадскога тэатра, "збудаваным, дарэчы,насродкі, сабраныя большай часткай па падпіснаму лістку". Таксама аўтар прыгадвае і цытуе газету "Могилевские губернские ведомости". Прыведзены факты пабудовы рэальнага вучылішча, абшчыны чырвонага крыжа, богаўгодных устаноў, адкрыцця ў 1902 г. руху па чыгунцы [4, с. 418].

Пры апісанні падзей пачатку ХХ ст. аўтар узгадвае, што "1904 год памятны магілёўцам жудасным яўрэйскім пагромам, наладжаным чорнай сотняй" [4, с. 418]. Апісваючы студзеньскія падзеі 1905 г., Шынклер прыгадвае дэманстрацыю магілёўцаў на Вялікай Садовай вуліцы. Далей аўтар выкрывае "відную ролю ў мерзкай рабоце чорнай сотні", якую адыгрываў епіскап Стэфаній. Узгадвае аўтар і час імперыялістычнай вайны. У горадзе тады размясцілася царская стаўка, "Магілёву суджана было зрабіцца на значны час другім цэнтрам Расійскай імперыі". Апісваецца, што цар змясціўся у Губернатарскім доме, што "быў спехам перайменаваны ў палац". Далей апісваюцца падзеі адрачэння цара і ліквідацыі стаўкі, "а 20 лістапада 1917 года Магілёў стаў савецкім" [4, с. 419].

Далей – прыгадваецца першы губернскі з'езд Саветаў і рашэнне падтрымаць савецкі ўрад. Цікава апісаны ў нарысе падзеі 1920 г. Менавіта бой 19 чэрвеня 1920 г. 35-га Магілёўскага аўтабронеатрада з "польскімі палкамі". Шынклер апісвае, як наперадзе атрада ішоў бранявік "Здань Валадарскага" [4, с. 420].

Гістарычныэкскурс у мінулае Магілёва Х. Шынклер завяршае 1923 годам, калі "Магілёў увайшоў у склад БССР". У заключнай частцы нарыса аўтар параўноўвае сучасныя яму 1930-я гг. з часамі царызму, паказвае прагрэс камуністычнага будаўніцтва ў Магілёве.

А напрыканцы Х. Шынклер прыводзіць такія словы, якія можна адрасаваць і сёння магілёўцам і гасцям горада:"Магілёўцы не забываюць пра шматвяковую гісторыю свайго горада, пра былы жахлівы прыгнёт і панаванне варожай шляхты, пра выбухі гневу народнага і барацьбу народа за сваю лепшую долю. Яны часта наведваюць свой гістарычнымузей, у якім любоўна сабрана і экспаніравана шмат матэрыялаў з мінулага, у якім надзвычай удала і выразна адлюстраван наш сённяшні дзень – радасны і светлы. Параўноўваючы жахлівае мінулае са сваім жыццём, моладзь магілёўская вучыцца горача любіць сваю краіну, ненавідзець яе ворагаў, яна рыхтуецца бараніць Радзіму" [4, с. 422].

### Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Скрыжалі памяці: З творчай спадчыны пісьменнікаў Беларусі, якія загінулі ў гады Другой сусветнай вайны: у 3 кн. Кн. 3 / уклад., біягр. давед. прааўт. і камент. А. Бельскага. – Мн.: Бел. кнігазбор, 2005. – 672 с.
2. Бяляцкі, А. Лёс і творчасць Хвядоса Шынклера // Дзеяслоў. - №59. [электронны рэсурс]. – Режим доступа: https://lit-bel.org/news/Lios--tvorchastsy-Hvyadosa-Shinklera-3295/ - Дата доступа: 03.10.2018.
3. Лысенка, А.Ф. Хвядос Шынклер / А.Ф. Лысенка // Беларускія пісьменнікі і літаратурны працэс 20–30-х гадоў. – Мн. : Навука і тэхніка, 1985. – С. 292–327.
4. Шынклер, Х. Выбраныя творы / Х. Шынклер. – Мн. : Дзяржаўнае выдавецтва БССР. Рэдакцыя мастацкай літаратуры, 1960. – С. 411–422.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова